УДК 373

# ЯНКА МАЎР – ПІСЬМЕННІК ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

***А. М. Алейнікава*** (СГК МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***Т. М. Шавялёва,***
выкладчык

Янка Маўр – пісьменнік-педагог, які з’яўляецца адным з заснавальнікаў беларускай савецкай дзіцячай літаратуры, а таксама адным з найбольш яркіх яе прадстаўнікоў [1].

Творчая дзейнасць Янкі Маўра пачалася ў 20-я гады, яна насіла пазнавальны характар для дзяцей. Першая яго аповесць «Чалавек ідзе» была надрукавана ў 1926 г. і адразу спадабалася маленькім чытачам. Аповесць «Чалавек ідзе» знаёміць іх з гісторыяй развіцця чалавечага грамадства, садзейнічае выхаванню матэрыялістычнага светапогляду. З гэтай аповесці дзеці даведваюцца аб жыцці першабытных людзей, пра іх развіццё.

Творы, якія былі напісаны пасля аповесці «Чалавек ідзе», таксама знаёмяць чытача са светам, з жыццём народаў Інданезіі, Гвінеі, Кітая і г. д.

У апавяданні «Незвычайная прынада» раскрываецца тэма трагічнага лёсу дзяцей працоўных ва ўмовах капіталізму. Надрукавана яна ў 1927 г. У творы расказваецца аб мінулым Індыі. Як сапраўдны педагог, Я. Маўр не тлумачыць у творы таго, што чытачы здольны зразумець самі. Пісьменнік не навязвае чытачам сваіх ведаў і думак.

Я. Маўр не толькі пашырыў тэматыку беларускай дзіцячай літаратуры. Ён з’явіўся таксама заснавальнікам новых жанраў у ёй. Напрыклад, аповесць «Чалавек ідзе» паклала пачатак развіццю навукова-папулярнага жанру ў беларускай літаратуры.

У апавяданні «Сын вады» (1927) аўтар актыўна ўздзейнічае на фантазію дзяцей, дае яркія малюнкі, вобразныя параўнанні. З гэтай аповесці дзеці многа даведваюцца пра фуіджынцаў [2].

У 30-я гады ў творчасці Я. Маўра пераважаюць тэмы, узятыя з жыцця савецкай краіны. Вялікім поспехам карыстаецца аповесць «Палескія рабінзоны» (1930). Героі аповесці – тыповыя прадстаўнікі сацыялістычнага грамадства.

У сэнсе вывучэння мясцовай геаграфіі і выхавання патрыятычных пачуццяў аповесць «Палескія рабінзоны» дае дзецям надзвычай многа.

## Літаратура

1. **Яфімава, М. Б.** Цэлы свет – дзецям : Творч. партрэт Я. Маўра. – Мінск, 1983.
2. Маўр Янка // Беларускія пісьменнікі (1917–1990): даведнік; склад. А.К. Гардзіцкі; нав. рэд. А. Л. Верабей. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. – 653 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова